№ 24(48)
Сьнежань 1999

Права на волю

Бюлетэнь Праваабарончага Цэнтру "Вясна—96"



Мінск, сьнежань 1999...

Год надзеяў і расчараваньняў

Сёлета Лукашэнку зноў давядзецца, як кажуць беларусы, у сабакі вачэй пазычаць, каб выйсьці на тэлеэкраны краіны з навагоднім віншаваньнем. Прайшоў яшчэ адзін год ягонага прэзідэнцтва, які яшчэ на крок аддаліў Беларусь і ўсіх нас, як грамадзянаў, ад незалежнага, заможнага і годнага жыцьця.

Чаго найперш чакаюць і хочуць людзі простыя, паспалітыя, якія, магчыма, нават і не задумваюцца над сэнсам такіх словаў як "права на волю", "права на працу", "права на адпачынак", "права на жыцьцё", нарэшце?.. А хочуць яны, каб іхняя дзяржава ды прэзідэнт гарантавалі ім прыстойнае жыцьцё сёньня і ўпэўненасьць у будучыні.

Пяць гадоў кіруе Беларусьсю Лукашэнка. Пяць гадоў падае краіна ў прорву. І кожны год здаецца, што падаць далей ужо няма куды. Але кожны год прыносіць усё новыя і новыя расчараваньні і жыцьцё, якое ўжо і летась здавалася невыносным, сёлета стала яшчэ горшым. Возьмем да прыкладу эканоміку. Усе нашыя суседзі, браты і сёстры "па саветах", ужо амаль забыліся, што такое інфляцыя. У нас жа яна па-ранейшаму мае прыстаўку "гіпер..." Нават па афіцыйных дадзеных за гэты год беларускі рубель абясцэніўся ў параўнаньні з далярам больш чым у 300 разоў! Адпаведна вырасьлі цэны на прадукты харчаваньня. А самі харчы пачалі надоўга зьнікаць з крамаў, па іх, як за савецкім часам, пачалі выстройвацца даўжэзныя чэргі, на іх пачалі ўводзіць нормы продажу, а сям-там і талоны. А бедны прэзідэнт, як ні стараецца, ніяк ня можа забясьпечыць народ харчаваньнем. Прыгадайце ягоныя словы, што сталі "крылатымі": "не пасьпеў узяцца за яйца, як прапала масла..." А тут яшчэ "неспрыяльныя надворныя ўмовы" і як вынік ураджай сабраны амаль напалову меншы, чым звычайна. Ня лепшыя справы і ў прамысловасьці. Большасьць заводаў калі і працуюць, дык ухаластую: склады затавараныя прадукцыяй, якую нават Расія і нават па бартэру браць ня хоча. І з палівам пастаянныя перабоі. Увесь год бензін то зьяўляўся "па ліміту", то зьнікаў наогул, а звадкаванага газу ў вёсках чакаюць месяцамі... Словам, куды ні кінь — клін.

Аднак адметным сёлетні год стаў найперш тым, што скончылася легітымнасьць Лукашэнкі як прэзідэнта Беларусі. І прызналі гэта ў абсалютнай большасьці краінаў сьвету. Працягвае гуляць з Лукашэнкам, як нібыта з прэзідэнтам, адная Расія. Толькі тут прымаюць яго на "дзяржаўным узроўні", толькі тут падпісваюць з ім "дамовы". Ды яшчэ якія! Аб аб'яднаньні ў адзіную дзяржаву. Што ж, хай пацешацца, не забываючы аднак, што якая ні смачная беларуская цукерка, праглынуць яе ня ўдасца. Бо што б там ні сьцьвярджалі афіцыйныя "сацыёлагі", сёньня большасьць беларусаў супраць палітычнага і ваеннага аб'яднаньня з краінай, якая ваюе, якая гэтаксама завязла ў невырашальных эканамічных праблемах. Вось таму і падпісвалася дамова 8 сьнежня цішком, без рэферэндуму, "праўкі" у яе ўносіліся

(Працяг на стар. 2)

Хроніка

8 сьнежня ў знак пратэсту супраць падпісаньня дамовы пра стварэньне саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі з Гарадзенскага дзяржаўнага медыцынскага інстытуту звольніўся дацэнт кафедры паталагічнай фізіялогіі Сяргей Мальчык. С.Мальчык распаўсюдзіў заяву, у якой гэтак тлумачыць прычыну свайго звальненьня: "8 сьнежня А.Лукашэнка, які незаконна займае пасаду прэзідэнта, учыніў цяжкае дзяржаўнае злачынства — зьнішчыў незалежнасьць Рэспублікі Беларусь. У тым, што адбылося ёсьць доля віны кожнага з нас. Але найбольшая віна за існаваньне гэтага рэжыму кладзецца на кіраўнікоў прадпрыемстваў і ўстановаў, у тым ліку нашага інстытута... Бяздумна выконваючы пісьмовыя і вусныя загады зьверху, вы праводзіце ў жыцьцё палітыку існуючага марыянетачнага рэжыму".

13 сьнежня супрацоўнікамі сьледчага ізалятара ГУУС Мінгарвыканкама быў жорстка зьбіты зьняволены дэпутат 13-га скліканьня Андрэй Клімаў. Пасьля зьбіцьця А.Клімаў быў дастаўлены ў суд Ленінскага раёну г. Мінску, дзе праходзіць слуханьне крымінальнай справы, узбуджанай у дачыненьні А.Клімава і былых супрацоўнікаў ААТ "Андрэй Клімаў і К°". Прадстаўніцтва АБСЕ ў Мінску выказала асаблівую заклапочанасьць у сувязі са зьбіцьцём А. Клімава і заклікала ўрад Беларусі "неадкладна расьследваць гэтае здарэньне, прадаставіць спадару Клімаву неадкладную медыцынскую дапамогу ў адпаведнай бальніцы і вызваліць яго з-пад варты".

(Працяг на стар.6-7)

Год надзеяў і расчараваньняў

(Пачатак на стар.1)

ў самы што ні на ёсьць апошні момант.

Пагаршалася жыцьцё ў краіне, павялічваўся і ўціск на апазіцыю, пашыралася і запалохваньне людзей, незадаволеных сваім становішчам. Апазіцыя правяла некалькі акцыяў пратэсту, сярод якіх самымі значнымі былі "Праводзіны прэзідэнта" 21 ліпеня і "Марш Свабоды" 17 кастрычніка. Сотні людзей былі затрыманыя, асуджаныя, зьбітыя (дакладныя лічбы па выніках году мы паведамім пазьней). Падзеяй году стала выбарчая кампанія па выбарах прэзідэнта краіны, наладжаная легітымным Вярхоўным Саветам у студзені-траўні. Былі і трагічныя падзеі. Зьніклі пры дагэтуль нявысьветленых абставінах былы міністр унутраных справаў Юры Захаранка і старшыня Цэнтрвыбаркаму Віктар Ганчар, раптоўна і загадкава памёр адзін з лідэраў апазіцыі Генадзь Карпенка... Восем месяцаў правёў за кратамі пад сьледзтвам былы прэм'ер-міністр, кандыдат у прэзідэнты Беларусі Міхаіл Чыгір. Паводле выступленьняў апазіцыі заведзена некалькі крымінальных справаў на актыўных удзельнікаў акцыяў пратэсту...

Такім, калі коратка, быў гэты год, які ні на крок не наблізіў нас да волі і справядлівасьці, да захаваньня дзяржавай элементарных канстытуцыйных правоў сваіх грамадзянаў. Да станоўчых вынікаў яго можна аднесьці хіба адно: міжнародная супольнасьць зацікавілася сітуацыяй у Беларусі і таму, бадай, як ніколі актыўна працавала ў нашай краіне місія АБСЕ. На жаль, даводзіцца канстатаваць, што новы год прадстаўніцтву АБСЕ давядзецца пачынаць з таго ж, з чаго і мінулы: са спробаў наладзіць дыялог паміж уладамі і апазіцыяй. З такой цяжкасьцю будаваныя ўвесь год масткі ў лістападзе-сьнежні былі разбураныя прэзідэнцкім бокам. Першая сумесная дамова аб прадастаўленьні эфірнага часу і газетных плошчаў у афіцыйных СМІ апазіцыі была праігнараваная, а кіраўнік дамоўнага працэсу з боку ўладаў М.Сазонаў і ўвогуле звольнены...

Што год наступны нам рыхтуе?.. Беларусы ніколі не вылучаліся сярод іншых сваім аптымізмам, а падзеі апошніх гадоў зрабілі многіх скончанымі песімістамі. І гэта, як ні парадаксальна, пакідае надзею на лепшае. Усё менш беларусаў спадзяецца на дапамогу збоку, усё больш разумее, што спадзявацца трэба толькі на ўласныя сілы. А значыць, шэрагі сьвядомых змагароў супраць таталітарызму, супраць узурпатара, за незалежнае і годнае жыцьцё будуць расьці...

Андрэй НАЛІВА



Мінскія міліцыянты рыхтуюцца да "бою".

Безабароненасьць

13 сьнежня Канстытуцыйны суд Рэспублікі Беларусь (нагадаем, што ўсе судзьдзі ў ім прызначаныя асабіста Лукашэнкам) прыняў рашэньне "Аб некаторых пытаньнях забесьпячэньня грамадзянам канстытуцыйнага права на атрыманьне юрыдычнай дапамогі ў крымінальным працэсе". Тым самым, можна лічыць, на афіцыйным узроўні было прызнанае тое, пра што даўно казалі беларускія праваабаронцы: праваахоўчыя органы на падставе аднаго з артыкулаў Крымінальна-працэсуальнага кодэксу РБ часта пазбаўлялі падсьледных права на абарону, якое гарантаванае канстытуцыяй. Канстытуцыйны суд паспрабаваў ліквідаваць супярэчнасьць, закладзеную ў КПК. У артыкуле 49 яго гаворыцца, што кожны затрыманы мае права на абарону, якая павінна быць прадастаўлена яму не пазьней, чым праз 24 гадзіны з моманту затрыманьня. Аднак у артыкуле 53 запісана, што адвакат можа сустрэцца з падабаронным толькі пасьля прад'яўленьня абвінавачаньня, г. зн., што затрыманы можа цэлых дзесяць дзён (абвінавачаньне прад'яўляецца на працягу гэтага тэрміну) знаходзіцца за кратамі без абароны. Што і практыкавалі беларускія праваахоўчыя органы. На жаль, гэтае рашэньне Канстытуцыйнага суда носіць усяго толькі рэкамендацыйны характар, бо ініцыявала разгляд яго група грамадзянаў. А значыць, ад парушэньня канстытуцыйных правоў (артыкул 62 Канстытуцыі РБ сьведчыць, што кожны грамадзянін краіны мае права на абарону) падчас крымінальнага працэсу па-ранейшаму ніхто не застрахаваны...

Двайная здрада

Заява Цэнтральнае Каардынацыйнае Рады Расійскае партыі Дэмакратычны Саюз

У сьнежні два народы, расійскі і беларускі, змогуць адзначаць адразу два горкія юбілеі. 22 сьнежня яны будуць успамінаць, як бальшавікі загналі іх у агульную клетку пад назовам СССР, а 8 сьнежня можна будзе адзначаць як іх, пасьля нядоўгай прагулкі, у гэтую клетку вярнулі.

Калі беларускі сатрап Лукашэнка, які даўно перастаў быць законным прэзідэнтам, заўсёды марыў здаць свой народ у абноўленую расійскую імперыю і ніколі ня ўтойваў гэтага, калі ён некалі прыйшоў да ўлады з лозунгам прадажніцтва і нацыянальнае здрады і зараз выканаў свае перадвыбарчыя абяцаньні, пазбавіўшы сваю краіну яе законнага сьцяга, герба, гімна і самой незалежнасьці, дык паводзіны Б.Ельцына здаюцца менш зразумелымі і таму больш вераломнымі.

Расія дастаткова вялікая, небясьпека з захаду ёй не пагражае, а сумнае становішча беларускай эканомікі агульнавядомае. Ніякія лагічныя прычыны, ніякі нацыянальны інтарэс ня мог падштурхнуць прэзідэнта Ельцына да заключэньня гэтага супрацьнатуральнага саюзу. Мы ня можам зразумець, чаму ён, замест таго, каб закончыць сваю палітычную кар'еру рэфарматарам, выратавальнікам свайго народу, абаронцам і прыхільнікам правоў і свабодаў, вырашыў закончыць яе гэтак сумна. Барыс Ельцын заканчвае свой другі прэзідэнцкі тэрмін як сьвядомы кат Чачні, таму што выпадкова двойчы не наступаюць на адныя і тыя ж граблі, прывязвае Расію да беларускага запаведніку таталітарызму і да палітычнага ізгоя Лукашэнкі і, нарэшце, паўтараючы Гіндэбурга, аддае ўладу над сваім народам і над сваёй сям'ёю ў рукі прыхільніка Андропава Пуціна — прадстаўніка той самай Лубянкі, супраць якой расійскі прэзідэнт змагаўся ў пачатку сваёй кар'еры.

Матывы гэтых нечуваных учынкаў нам не зразумелыя. Але нашая трактоўка іх вынікаў ня можа ад гэтага зьмяніцца. Гэта здрадніцтва. Здрадніцтва і забыцьцё Канстытуцыі і свайго дзяржаўнага і чалавечага абавязку. І Расія, якая некалі благаслаўляла Барыса Ельцына, сёньня мае права яго праклінаць.

В.Навадворская, Н.Злотнік, М.Кузьменка, В.Цярэшчанка.

9 сьнежняя 1999 г.

цыйную заяву, у якой сказана: "Зьбіцьцё Андрэя Клімава, дэпутата Вярхоўнага Савету 13-га скліканьня, якое адбылося 13 сьнежня, указвае на глыбіню палітычнага крызісу ў Беларусі і яе самаізаляцыі ад еўраатлантычнай супольнасьці дэмакратычных дзяржаваў. Дэпутат Клімаў быў зьбіты ахоўнікамі ў турме, дзе знаходзіўся ў папярэднім зьняволеньні з лютага 1998 г. па палітычна матываваных абвінавачаньнях. Беларускія ўлады павінны прыняць меры для расьсьледваньня інцыдэнту і пакараньня вінаватых. Урад ЗША заклікае беларускае кіраўніцтва вызваліць дэпутата Клімава і іншых затрыманых і зьняволеных па палітычных матывах".

24 сьнежня Пракуратура Рэспублікі Беларусь адмовілася задаволіць хадайніцтва прадстаўнікоў абароны зьняволенага дэпутата Вярхоўнага Савета 13-га скліканьня Андрэя Клімава ва ўзбуджэньні крымінальнай справы факце яго зьбіцьця. Прадстаўнікі пракуратуры заявілі, што праведзеная імі праверка падцьвердзіла правамоцнасьць усіх дзеяньняў аховы ("прымусовая мера дастаўкі ў суд"). Варта нагадаць, што з папярэдняга медыцынскага заключэньня, зробленага ўрачом "хуткай дапамогі", які прыбыў у будынак суда, вынікае, што ў Клімава была выяўленая чэрапна-мазгавая траўма і траўма жывата.

27 сьнежня ўступіў у сілу Закон "Аб унясеньні зьменаў і дадаткаў у некаторыя заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь", падпісаны А.Лукашэнкам. Згодна гэтаму закону павінны быць унесеныя папраўкі ў Кодэкс аб Адміністратыўных Правапарушэньнях і Закон "Аб друку і іншых сродках масавай інфармацы". У КаАП РБ зьявіцца артыкул 167-10 і 167-11. Артыкул 167-10 прадугледжвае адказнасьць за дзейнасьць незарэгістраванай альбо неперарэгістраванай палітычнай партыі ці грамадзкага аб'яднаньня (папярэджаньне альбо штраф ад 10 да 50 мінімальных заробкаў). Паўторныя дзеяньні на працягу года могуць карацца штрафам ад 50 да 100 мінімальных заробкаў альбо адміністратыўным арыштам тэрмінам да 15 сутак. Артыкул 167-11 прадугледжвае адміністратыўную адказнасьць за непрадастаўленьне рэгіструючаму органу ў месячны тэрмін дадзеных аб зьмене юрыдычнага адрасу (штраф да 30 мінімальных заробкаў).

Інфармацыйны аддзел «Вясны»

Каб хоць трохі палегчыць жыцьцё...

Гуманітарная акцыя Праваабарончага Цэнтру "Вясна"

Згодна з апошнімі статыстычнымі зьвесткамі ў Беларусі жыве 2 мільёны 657 тысяч пенсіянераў (гэта кожны чацьвёрты жыхар). Сёлета больш за 50% пенсіянераў у Беларусі атрымліваюць пенсію меншую за мінімальны спажывецкі бюджэт. А ў Брэсцкай вобласьці такіх пенсіянераў каля 90%... Калі ў вёсках пенсіянеры маюць уласную гаспадарку і выжываюць з яе дапамогай, дык у горадзе ім часам не хапае нават на хлеб. Асабліва пакутуюць адзінокія, тыя, хто ня мае дзяцей. Без шырокай грамадзкай дапамогі ім сёньня ня выжыць... А таму сёлетняй восеньню Праваабарончы Цэнтр "Вясна" разам з Камітэтам грамадзкага самакіраваньня (КГС) ЖЭС-66 г. Мінску, што месьціцца на вуліцы Лынькова, правёў дабрачынную акцыю. ПЦ "Вясна" перадаў КГС гуманітарную дапамогу, якая была распаўсюджаная сярод пенсіянераў і інвалідаў. Больш за сорак сем'яў атрымалі па некалькі рэчаў — паліто, пінжакі, кашулі, штаны, швэдары... Прыём і раздачу гуманітарнай дапамогі арганізавалі старшыня КГС Раіса Тарасюк і яе памочніца Ганна Трыфанава.

Хто ж яны тыя, каму сёньня неабходная дапамога? Ці шмат мы ведаем пра гэтых людзей, пра тое, якім чынам выжываюць яны ў сёньняшніх варунках? Давайце пазнаёмімся бліжэй з некаторымі з іх.

Вось, да прыкладу, Ларыса Аляксандраўна Хаміцэвіч. Стрыманая ў словах і эмоцыях жанчына. Ужо некалькі гадоў яна на пенсіі. Атрымлівае сем мільёнаў рублёў (менш за 10 даляраў ЗША). Удава. Жыве з дачкою-інвалідам. У дзяцінстве дачка хварэла і ёй разам з уколамі занесьлі цяжкую хваробу — энцэфаліт. Зараз дачцы 26 год. Пенсія ў яе таксама 7 мільёнаў рублёў...

А вось сям'я Майсейчыкаў. Дзьмітры Іванавіч амаль сорак гадоў адпрацаваў кіроўцам, у апошнія гады на вялікагрузных аўтамашынах. У 1992 годзе, за тры дні да выхаду на пенсію, у яго здарыўся інсульт. Хваробу пераадолеў, але адна рука засталася часткова паралізаванаю. Дыябетык. Год таму, пасьля доўгіх беспасьпяховых спробаў вылячыць язвы на правай назе, давялося яе ампутаваць. Цяпер ён інвалід першай групы. Прычыну зьяўленьня язваў на назе тлумачыць так: "26 красавіка 1986 году, у дзень аварыі на Чарнобыльскай АЭС, я і яшчэ некалькі кіроўцаў былі ў камандзіроўцы пад Гомелем. Усіх кіроўцаў вялікагрузных аўтамашынаў прымусілі тады займацца перавозкамі грузаў з чарнобыльскай зоны. Ніхто нікому нічога не тлумачыў. На трэці дзень пасьля ўзрыву рэактара я быў у самім Чарнобылі. Калі нарэшце вярнуўся ў Мінск, машыну не пусьцілі нават у гараж. Але і тады нічога не патлумачылі пра тое, як берагчыся нам, людзям. Праўда, выплацілі падвойны заробак. Пасьля гэтага я перанёс два інфаркты..."

У Дзьмітрыя Іванавіча ёсьць дачка і сын. Аднак жывуць яны асобна, далёка. У аддзеле сацыяльнага забесьпячэньня далі яму інвалідную каляску. А яна ў ліфт ня ўлазіць. Дабіўся іншай. Зноў праблема: спусьцішся на ліфце, а там да зямлі яшчэ восем прыступак — не прыстасаваныя нашыя дамы для інвалідаў. Сядзі і чакай, пакуль адразу двое здаровых мужчынаў побач пройдуць і дапамогуць...

Яшчэ прыклад. Пенсіянерка Марыя Мікалаеўна Іванова. Амаль усё жыцьцё адпрацавала на абутковай фабрыцы "Прамень". Цяпер ёй 71 год, пенсія 12 мільёнаў рублёў. Муж разьбіўся на матацыкле. Пацярпела пры гэтым і маленькая тады дачка. Зараз ёй 43 гады, яна інвалід першай групы. Пенсія 6 мільёнаў рублёў...

Падобныя лёсы і ў астатніх пенсіянераў і інвалідаў, якія атрымалі дапамогу. Ва ўсіх іх сёньня грошай не хапае нават на самую простую ежу, а адзеньня ім і ўвогуле недакупіцца.

ПЦ "Вясна" дзякуе Вользе Ждановіч за збор гуманітарнай дапамогі. Асобная падзяка — ксяндзу Уладыславу Завальнюку, які таксама шмат дапамагаў. Дзякуем ім ад імя ўсіх, каму іхняя дапамога хоць трохі палегчыла жыцьцё.

Валеры ФІЛІПАЎ

"Спадзяюся, што гэты перыяд хутка застанецца толькі ў маёй памяці..."

(Пачатак на стар.3)

эканамічна пакараць. А што рабіць чалавеку, які жыве ў вёсцы і ня можа мець свой падворак? У краме ён нічога ня купіць, таму што ён не атрымлівае свайго заробку — на сваім прысядзібным участку, можа, што і вырасьціць. Але я лічу, што трэба ўмовы стварыць, каб ён мог зарабляць і нармальна жыць – тады ў яго і адпадзе неабходнасьць красьці. Калі ж не стварылі ўмоваў, то што яго зараз у турму саджаць? Пытаньняў шмат. І іх неабходна неадкладна вырашаць...

Ад рэдакцыі. На пасяджэньні распараджальнага суда была прызначаная дата разгляду судовай справы Міхаіла Чыгіра Мінскім гарадзкім судом – 27 сьнежня. Але пад уплывам грамадзкасьці намесьнікам Старшыні Вярхоўнага Суда РБ быў пададзены пратэст на вызначэньне распараджальнага суда. 22 сьнежня судовая калегія па крымінальных справах Вярхоўнага Суда РБ разглядзела гэты пратэст і адмяніла папярэдняе рашэньне. У вызначэньні сказана: "Згодна з арт. 223 КПК, у стадыі перадачы суду не вырашаецца пытаньне аб даказанасьці прад'яўленага абвінавачаньня, правільнасьці кваліфікацыі злачынных дзеяньняў і вінаватасьці прыцягнутых па справе асобаў.

Дадзеныя патрабаваньні закону судом у поўнай меры ня выкананыя.

Акрамя гэтага, судом дапушчаныя і іншыя парушэньні крымінальна-працэсуальнага закону".

Такім чынам, рашэньне распараджальнага суда адменена, і на сёньняшні дзень невядома, калі адбудзецца суд па "справе Чыгіра".

Гутарыла Тацяна РЭВЯКА

Алесь БЯЛЯЦКІ

Усяго толькі суткі,

альбо Рэпартаж з міліцэйскае "дзяжуркі"

«Хадзі сюды, — паклікаў дзяжурны першага студэнта, — расьпішыся вось тут. Заўтра прыйдзеш зраніцы, пойдзеш да начальніка і патлумачыш яму, як ты сюды патрапіў. Што рабіць з табою, вырашаць будзе ён, а я напісаў, што стан ап'яненьня ў цябе не прасочваецца».

Шчасьлівы студэнт мітульгам выляцеў з дзяжуркі. Затое другі заплакаў яшчэ мацней.

«Чаго ты равеш?» — запытаўся ў яго міліцыянт. «Я ж у КДБ думаў ісьці працаваць» – румзаў студэнт. «Трэба было спачатку пайсьці, а потым гарэлку піць», – стаў павучаць яго дзяжурны. «Мяне б туды па блаце ўладкавалі», – спрабаваў растлумачыць яму хлопец. «Толькі нас бедных міліцыянтаў па блаце нікуды не бяруць», – заўважыў сам сабе дзяжурны.

Неўзабаве зьявіўся чарнявы капітан, які езьдзіў дадому па дыхлафос. «Усё пуцём», — сказаў ён, струшваючы з сябе вільготны сьнег. Амаль адразу за ім зайшлі два сяржанты – канвой.

Нас вывелі па два чалавекі і рассадзілі ў розныя аддзяленьні аўтазэка. Я са сваім сукамернікам патрапіў у так званы «стакан»: маленькае адгароджанае аддзяленьне на два месцы. Вакол нас была суцэльная настылая — не прытуліцца — бляха. Мы паехалі "катацца" па Мінску і зьбіраць іншых небаракаў. Бензіну ў міліцыі не хапала і ўсіх "сутачнікаў" ды "івээсьнікаў" з розных раённых аддзяленьняў зьбіраў адзін вячэрні аўтазэк.

У Першамайскім РАУСе ў наш "стакан" падсадзілі худога невысокага хлопчыка, які сеў да нас на калені. «А цябе за што?» - спытаўся мой сусед. «За грабеж», — адказаў той». «А колькі ж табе гадоў?» — зьдзівіўся сусед. «Чатырнаццаць» – адказаў хлопец. Выглядаў ён гадоў на дванаццаць, ня болей.

Потым мы заехалі на Дабрамысьленскую, да ізалятару часовага ўтрыманьня, дзе прастаялі больш за гадзіну і задубелі канчаткова. Калі аўтазэк пасьля чатырох гадзінаў язды па горадзе дабраўся да Акрэсьцінскага ізалятару, мы заходзілі туды амаль як у родны дом. Наперадзе нас чакала цёплая камера і драўляныя нары, на якіх, урэшце, можна было выспацца.

Мяне пасялілі асобна, выдзяліўшы чацьвёртую «хату», дзе я вольна разьмясьціўся і з асалодаю заснуў.

Я праспаў праверку, адно толькі чуў, як у камеру зазірнуў дзяжурны. Я варухнуў нагою, каб паказаць, што жывы, і працягваў спаць далей. Разбудзілі мяне а дзесятай гадзіне. Зайшоў мардаты прапаршчык, які загадаў хутка зьбірацца, бо ўжо чакала машына. Гэта быў іншы аўтазэк. Мяне не зачынялі, а пасадзілі на асобнае крэсла паміж закратаванымі катухамі.

«За што гэта вас?» — спытаўся прапаршчык. «За семнаццатае кастрычніка» – адказаў я. «Відаць, вы там вялікі бугор?..» – пасьміхаючыся, працягваў міліцыянт гаворку. «Ня тое, каб надта», – адказаў я. «Ну і што толку, чаго вы дабіваецеся?» – не змаўкаў ён, — былі б вы пры ўладзе, і пры вас было б тое ж самае». «Наўрад ці, — адказаў я, — Прынамсі, саюзу з Расіяй не было б дакладна». «А што Саюз, — працягваў прапаршчык, — за Саюзам я ста сорак рублёў атрымліваў і мне хапала». «Пра той Саюз можаце забыцца, — цьвёрда адказаў я, ведаючы, што бессэнсоўна пераконваць яго ў наканаванасьці на пагібель той дзяржавы: не зразумее і не захоча разумець. — Два разы ў адну і тую ж ваду ня ўвойдзеш... Трэба думаць пра будучыню. А я не хачу, каб мае дзеці ваявалі ў Чачні». «І я не хачу», — падтрымаў мяне прапаршчык. "Значыць усё ня так кепска", — падумаў я.

У Савецкім РАУСе мяне ўжо чакалі. Амаль адразу капітан Левановіч пераняў мяне і мы пайшлі, вось дык нечаканасьць, у міліцэйскі "форд", на якім і паехалі ў апорны пункт на Камароўку, дзе таксама знаходзіўся і кабінет судзьдзі. Пасьля настылага бляшанага аўтазэка мяккі "форд" з цёплым паветрам... Занадта вялікі кантраст, каб не заўважыць пераменаў, што адбыліся за лічаныя хвіліны.

У апорным пункце мяне завялі ў адзін з міліцэйскіх кабінетаў, дзе патрымалі хвілінаў дзесяць, а потым паведамілі, што судзьдзя занятая, таму сёньня суд адкладаецца, і мне выпішуць позву на аўторак. Я адчуваў, што гэтак будзе лепей, хаця і не зусім разумеў, чаму яны мяне выпускаюць. І толькі праз некалькі дзён мне распавялі, што размова пра маё затрыманьне была з Латыпавым (міністр замежных справаў РБ) у Стамбуле, дзе тады праходзіў стамбульскі саміт краінаў АБСЕ. Гаварыў пра гэта нехта з даволі адказных асобаў, і менавіта адтуль з акружэньня Лукашэнкі паляцеў сігнал у Мінск: выпусьціце!!! Ад граху падалей!..


Ускосна гэта пацьвердзіла і судзьдзя, якая на званок адвакаткі сказала, што маю справу яна і ў вочы ня бачыла. Значыць міліцыянты яе проста не перадавалі, а завёўшы мяне ў свой кабінет, вытрымалі дзеля прылiку некалькі хвілінаў і адпусьцілі, каб разабрацца са мною пасьля заканчэньня сустрэчы ў Стамбуле.

Я прайшоў праз людную Камароўку, праз рады, заваленыя яблыкамі і хурмой, па праспэкце Скарыны да ўправы Беларускага Народнага Фронту, і так прыемна было адчуваць сябе вольным. Ня менш прыемна, чым было папярэднія два разы за гэты год, калі сядзець даводзілася па дзесяць сутак.

Суткі, усяго толькі суткі пратрымала мяне ў сваіх адбымках карная машына нашай хворай дзяржавы... У хворай дзяржавы ня можа быць здаровая міліцыя, пракуратура, суд, прыёмнікі-разьмеркавальнікі і турмы. Тут усё праіржавела і разьедзенае іржой. І гэта ўсё, прыйдзе час, нам трэба будзе зьмяняць, зьмяняць як найхутчэй. Бо кожны дзень існаваньня чалавека ў падобных умовах – гэта ганьба для дзяржавы, гэта сорам для ўсіх нас.

Я часта думаю пра тое, што ўсё, што ў нас адбываецца зараз – гэта толькі прэлюдыя, гэта толькі запеў. І колькі б ён ні цягнуўся гэты запеў, ён часовы. А сапраўдная праца, сапраўднае змаганьне за чалавечую годнасьць, за Беларусь, пачнецца пасьля. Пасьля таго, як... І тады нам давядзецца па-сапраўднаму даказваць, чаго мы вартыя. Дэмакратычныя зьмены ў грамадстве, незалежная Беларусь – вось тое поле, дзе пачнецца праўдзівая работа і дай нам Бог розуму зрабіць усё па-людзку, так як належыць.

(Працяг. Пачатак у №22-23)



Права на волю. Бюлетэнь Праваабарончага Цэнтру "Вясна-96".
Выходзіць два разы на месяц на беларускай, ангельскай і рускай мовах. Наклад 299 асобнікаў.
Адрас рэдакцыі: 220013 Менск, а/с 49. E-mail:viasna 96@open. by Рэдактар Алесь БЯЛЯЦКІ.
Пры передруку абавязковая спасылка на бюлетэнь.

У нумары скарыстаныя фотаздымкі з архіву Цэнтру "Вясна-96"